

# Беларусь і Расія: дыялог культур

**Сумеснае пасяджэнне калегій Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь і Міністэрства культуры Расійскай Федэрацыі прайшло на гэтым тыдні ў Нацыянальнай бібліятэцы. У мерапрыемстве паўдзельнічалі міністр культуры Беларусі Руслан Іосіфавіч Чарнецкі, намеснік міністра культуры Расіі Андрэй Уладзіміравіч Малышаў, міністр культуры Татарстана Ірада Хафізянаўна Аюпава, супрацоўнікі ведамстваў, кіраўнікі ўстаноў культуры.**

## СЛОВА — МІНІСТРУ

Спачатку **Руслан Чарнецкі** павітаў удзельнікаў пасяджэння і пажадаў усім плённай працы, а гасцям — яшчэ і задавальнення ад знаходжання ў нашай краіне.

Дарэчы, праца насамрэч атрымалася грунтоўнай: былі падведзены вынікі выканання плана супрацоўніцтва паміж міністэрствамі Беларусі і Расіі на 2025 год.

— Праграмны дакумент уключыў 75 мерапрыемстваў, — нагадаў Руслан Іосіфавіч. — Усе яны выкананы, праекты рэалізаваны ў поўным аб'ёме. Фактычнае ж супрацоўніцтва аказалася больш прадуктыўным і выйшла за межы плана.

Сярод самых значных форумаў у рамках Саюзнай дзяржавы міністр культуры Беларусі назваў свята "Купалле" ("Александрыя збірае сяброў"), да якога летась далучылася 27 расійскіх рэгіёнаў, і XXXIV Міжнародны фестываль мастацтваў "Славянскі базар", які прыняў дэлегацыі з 16 абласцей. Руслан Чарнецкі выказаў упэўненасць, што і надалей кола сяброўства будзе пашырацца.

У сваім дакладзе кіраўнік ведамства спыніўся на супрацоўніцтве ў музейнай сферы, дзе ключавымі формамі работы сталі маштабныя сумесныя выставы, форумы і праграмы па абмене вопытам. Важныя напрамкі ўзаемадзеяння — захаванне гістарычнай спадчыны, патрыятычнае выхаванне моладзі, праекты ў бібліятэчнай справе, кінаіндустрыі і выканальніцкіх мастацтвах.

У якасці прыкладу міністр назваў шэраг абменных спектакляў, паказаных беларускімі тэатрамі на расійскіх сцэнах і наадварот, супольную стужку "Чорны замак", што прынесла стваральнікам узнагароду I Еўразійскай кінапрэміі "Брыльянтавы матылёк" у намінацыі "Найлепшы кампазітар", і здымкі карціны "Бацька Мінай. Партызанская легенда", якія ажыццяўляюцца "Беларусьфільмам" і расійскай студыяй "Ваенфільм".

— Зразумела, не магу не сказаць пра наш легендарны ансамбль "Песняры", які ў 2025 годзе правёў маштабны гастрольны тур са 121 канцэрта ў 60 гарадах Расіі! — зазначыў Руслан Чарнецкі.

Разам з тым, па яго словах, яшчэ ёсць вялікі патэнцыял для ўзаемнага збліжэння, інтэграцыі сфер культуры.

## РАСІЙСКІ ПОГЛЯД

Намеснік міністра культуры Расіі **Андрэй Малышаў** лічыць, што сувязь паміж народамі нашых краін парушыць немагчыма. Гэтую выснову пацвярджае цеснае і плённае супрацоўніцтва ў галіне культуры:

— У нас адна мінуўшчына, адна спадчына, адны каштоўнасці, — упэўнены Андрэй Уладзіміравіч. — Сённяшняе мерапрыемства яшчэ раз падкрэслівае, што мы крочым у патрэбным напрамку, моцна ўзяўшыся за рукі.

У рамках пасяджэння здарыўся важны момант у сферы інтэграцыі. Міністр культуры Татарстана **Ірада Аюпава** і міністр культуры Беларусі Руслан Чарнецкі падпісалі дарожную карту па выкананні пагаднення аб супрацоўніцтве паміж ведамствамі. Ірада Хафізянаўна заявіла:

— На працягу апошніх шасці гадоў у нас дзейнічае вялікая сумесная праграма па супрацоўніцтве з установамі культуры Рэспублікі Беларусь.

Так, па словах Ірады Аюпавай, заусёды з задавальненнем прыязджае на гастролі ў нашу краіну Казанскі акадэмічны рускі Вялікі драматычны тэатр імя В. Качалава — спектаклі наведала больш за 60 тысяч беларускіх гледачоў. З аншлагамі на арэне Белдзяржцырка праходзіла праграма "Мірас" татарскай трупы. Актыўна развіваецца супрацоўніцтва паміж музеямі.

— У Татарстане ёсць чатыры аб'екты Сусветнай спадчыны ЮНЕСКА, якія супрацоўнічаюць з установамі Беларусі, — паведаміла міністр. — У вас вельмі эфектыўныя інструменты выкарыстання помнікаў Сусветнай спадчыны. Мір, Нясвіж — гэта ўнікальныя аб'екты і ўнікальны вопыт, які мы пераймаем і прымяняем у сваёй працы.

У планах на гэты год дэманстрацыя на расійскіх пляцоўках маштабнага беларускага праекта — канцэрта-рэквіема "Кожны трэці". Андрэй Малышаў упэўнены, што гэта найлепшы прыклад таго, як сучаснымі візуальнымі сродкамі магчыма транслiраваць каштоўнасную мадэль і даносіць да юных грамадзян сапраўдную гісторыю.

## АБМЕН ВОПЫТАМ

Супрацоўніцтва паміж Беларуссю і Расіяй наладжана ў розных кірунках: у тэатральным, цыркавым і выяўленчым мастацтвах, кінаіндустрыі, адукацыі, музейнай і бібліятэчнай дзейнасці.

Прыкладам, у бібліятэчнай сферы існуе глыбокая інтэграцыя на ўзроўні нацыянальных і рэгіянальных устаноў, арыентаваная на стварэнне адзінай інфармацыйнай і культурнай прасторы.

— Нацыянальная бібліятэка Беларусі, — распавёў генеральны дырэктар **Вадзім Гігін**, — мае 28 пагадненняў аб супрацоўніцтве з рознымі найбуйнейшымі ўстановамі культуры, адукацыі і навукі Расіі, у рамках якіх прадугледжваецца абмен бібліятэчнымі дакументамі, публікацыямі і іншымі інфармацыйнымі рэсурсамі, супрацоўніцтва ў галіне бібліятэчнай справы.

Па словах Вадзіма Францавіча, у 2025-м Нацбібліятэка сумесна з прадстаўніцтвам Рассупрацоўніцтва ў Мінску арганізавала цыкл лекторыяў "Вехі Вялікай Айчыннай вайны", прымеркаваных да 80-годдзя Перамогі, пры ўдзеле вядучых даследчыкаў з дзвюх краін.

— Наша супрацоўніцтва доўгатэрміновае і плённае, — упэўнены генеральны дырэктар Расійскай дзяржаўнай бібліятэкі **Вадзім Дуда**. — Важна тое, што яно ажыццяўляецца ва ўзроўні як галоўных устаноў культуры, так і рэгіянальных — абласных, краявых, раённых і нават сельскіх. Мы карысныя адны адным — і гэта цудоўна!

## РЭГІЁНЫ

Як зазначыў у дакладзе Руслан Чарнецкі, у мінулым годзе дынамічна развівалася рэгіянальнае супрацоўніцтва: прадстаўнікі ўстаноў культуры і творчых калектываў Беларусі ўзаемадзейнічалі з 84 суб'ектамі Расіі. На працягу года было зладжана больш за 600 сумесных мерапрыемстваў!

Шырока праводзяцца Дні культуры Беларусі ў рэгіёнах суседняй дзяржавы. Напрыклад, маштабная праграма ў Смаленскай вобласці ўключала выставу работ нашых майстроў дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва "Дакрануцца да спадчыны душой", паказы кінастужак "Беларусьфільма", святочны канцэрт з удзелам айчынных творчых калектываў і салістаў ды многае іншае.

— Цэнтральная тэма рэгіянальнага супрацоўніцтва ў сферы культуры — Вялікая Перамога і захаванне гістарычнай памяці, — паведаміла начальнік галоўнага ўпраўлення культуры Мінскага абласнога выканаўчага камітэта **Ала Шахоцька**. — Такому выбару спрыяе размешчаны на тэрыторыі Міншчыны мемарыяльны комплекс "Хатынь" і яго фі-





ліялы "Курган Славы" і "Дальва". Іх у мінулым годзе наведалі тысячы расіян, у тым ліку студэнты і школьнікі.

Да таго ж, па словах Алы Канстанцінаўны, удала гастралююць па суседняй дзяржаве трупа Мінскага абласнога драматычнага тэатра і капэла "Санорус", вядзецца абмен вопытам паміж бібліятэкамі.

Ёсць планы і на гэты год. Так, дасягнуты дамоўленасці аб правядзенні ў 2026-м Дзён культуры Беларусі ў Самарскай вобласці, а таксама Дзён культуры Смаленскай вобласці ў нас.

## АДУКАЦЫЯ

Як заявіла падчас выступлення начальнік аддзела ўстаноў адукацыі Міністэрства культуры Беларусі **Марына Юркевіч**, супрацоўніцтва паміж краінамі па яе профілі ў 2025 годзе было накіравана на стварэнне адзінай культурна-адукацыйнай прасторы Саюзнай дзяржавы, інтэграцыю вучэбных праграм і падтрымку маладых талентаў. Так, арганізавана сумесная работа з 27 федэральнымі ВНУ Масквы, Санкт-Пецярбурга, Смаленска, Арла, Кемерава, Саратава, Чэлябінска, Екацярынбурга, Казані, Петразаводска і іншых населеных пунктаў.

Да прыкладу, 12 студэнтаў Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў прайшлі навучанне ў Санкт-Пецярбургскім дзяржаўным інстытуце культуры. А ўніверсітэт прыняў 12 чалавек з расійскай ВНУ. Аналагічны абмен адбыўся ў БДУКМ з Гжэльскім універсітэтам і Маскоўскім дзяржаўным інстытутам культуры.

Рэалізаваны міжнародны праект "Харавы саюз", у якім паўдзельнічалі студэнты Беларускай дзяржаўнай акадэміі музыкі і Расійскай акадэміі музыкі імя Гнесіных. Ініцыятыва "Дыялог культур — масты сяброўства" з'яднала маладых выканаўцаў нашай краіны, Петразаводска і Алматы. Канцэрты на вядомых пляцоўках Масквы і Мінска ладзіліся ў рамках праекта Саюзнай дзяржавы "Гастролі Маладзёжнага аркестра". Калектыў складаецца са студэнтаў музычных ВНУ Расіі ды Беларускай дзяржаўнай акадэміі музыкі.

— Такія сумесныя мерапрыемствы спрыяюць раскрыццю патэнцыялу студэнтаў; гэта — выдатны вопыт для выканальніцкага майстэрства, — лічыць рэктар БДАМ **Алена Куракіна**.

Адной з найбольш яскравых падзей названы фестываль Саюзнай дзяржавы "Творчасць юных". Летась ён прайшоў у Маскве на пляцоўцы IV Міжнароднага дзіцячага культурнага форуму. У рамках фестывалю адбыліся майстар-класы, індывідуальныя заняткі і творчыя лабараторыі з вядучымі педагогамі расійскіх ВНУ, а таксама сустрэчы са знакамітымі артыстамі. Да мерапрыемства далучылася больш за 200 чалавек!

## УЗНАГАРОДЫ

Нагрудным знакам "За ўклад у развіццё культуры Беларусі" ўзнагароджаны міністр культуры Татарстана Ірада Аюпава і намеснік міністра культуры Расіі Андрэй Малышаў.

— У Беларусі мы адчуваем сябе ў дружалюбнай атмасферы. Нас вельмі многае аб'ядноўвае, — зазначыла Ірада Хафізянаўна.

## "СІМФОНІЯ..."

Мультымедыйны канцэрт "Сімфонія інавацый" прагучаў у Палацы Рэспублікі. Сюжэт будуецца вакол дыялогу музычных геніяў мінулага — Сяргея Рахманінава, Аляксандра Скрабіна, Сяргея Пракоф'ева — і дапаўняецца інавацыямі XXI стагоддзя. Імпрэза прадэманстравала, як перадавыя тэхналогіі могуць спалучацца з культурнай спадчынай.

У Расіі прэм'ера ўнікальнага шоу адбылася летась у Маскве на падмостках Дзяржаўнага акадэмічнага Малога тэатра. Паказы таксама арганізавалі ў Санкт-Пецярбургу.

У нашай краіне "Сімфонія інавацый" прадстаўлена ўпершыню. На сцэне Палаца Рэспублікі — выступленне робата-дырыжора з рэальнымі артыстамі і вядомыя расійскія класічныя творы ў выкананні галаграм, згенерыраваных штучным інтэлектам. Спалучэнне класічнай музыкі з тэхналогіямі па-новаму адкрывае багатую спадчыну і выклікае вялікую цікавасць аўдыторыі, асабліва моладзі. Канцэрт прайшоў у суправаджэнні Маскоўскага дзяржаўнага сімфанічнага аркестра пад кіраўніцтвам заслужанага артыста Расіі Івана Рудзіна.

## ДНІ КУЛЬТУРЫ

Пры падтрымцы міністэрстваў культуры абедзвюх дзяржаў падрыхтавана серыя імпрэз у рамках Дзён культуры Расіі ў Беларусі.

Так, у фае Палаца Рэспублікі разгарнулася тэматычная выстава "Дыялог мастацтва і тэхналогій". Яна прысвечана жыццю вялікіх рускіх кампазітараў, творы якіх гучаць у "Сімфоніі інавацый". У экспазіцыю ўвайшлі партрэты, візуальныя прыклады пастановак і гісторыі, якія змянілі музычны свет.

Спецыяльна для гэтых Дзён культуры кампаніяй "Раскіно" арганізаваны Фестываль расійскага кіно. У мінскім кінатэатры "Масква" і брэсцкім "Беларусь" прадстаўлены фільмы розных гадоў: "Авіятар", "Беларускі вакзал", "Бураціна", "Ваўчок", "Доктар Дыназаўраў", "Ідзі і глядзі", "Кракен", "Ляўша", "Чабурашка 2".

**Ірына СТАНКЕВІЧ**
Фота Уладзіміра ШЛАПАКА

На здымках:
1. Падчас пасяджэння.
2, 3. Узнагароды атрымалі Андрэй Малышаў і Ірада Аюпава.
4. Святочны канцэрт.

